Вольга СІДАРОВІЧ, БелТА.

Віцебск.

Открытое письмо Генеральному прокурору Республики Беларусь О.Божелко

У меня складывается впечатление, что расследование преступления затягивается умышленно...

2 августа 1996 года сержант Березовского РОВД Н.Н.Тышкевич совершил ДТП, в результате которого погиб мой муж Юрий Викторович Разумейчик. С места происшествия Тышкевич скрылся. У меня на иждивении остались четверо неполнолетних детей.

Со дня возбуждения уголовного дела по факту ДТП прошло свыше года. По разным причинам следствие неоднократно приостанавливалось.

До сих пор расследование преступления не закончено, дело в суд не направлено.

Причины столь длительного расследования мне, как потерпевшей, никто не разъясняет.

По данному вопросу я неоднократно, лично и письменно, обращалась в прокуратуру Березовского района Брестской области, в прокуратуру Республики Беларусь, дважды ездила на личный прием в Администрацию президента.

Но ни разу конкретного ответа не получила.

Мне сообщают, что дело взято на контроль в прокуратуре Республики Беларусь. Однако иначе, как отписками, все эти ответы я назвать не могу.

В сентябре текущего года я вновь лично обратилась к следователю прокуратуры Березовского района Э.Л.Прилуцкому, проводящему расследование. Он мне коротко ответил: "У меня нет времени".

Прошу Вас пояснить мне, а на что же должно быть время у следователя прокуратуры, в должностные обязанности которого и входит именно расследование преступлений?

Около месяца назад я, как потерпевшая, попросила следователя вызвать и допросить одного из очевидцев ДТП, которого я сама установила (Береза — город небольшой, и здесь все друг друга знают). Однако и это мое ходатайство, которое я считаю чрезвычайно для меня важным, а для следователя — не требующим столь много времени, не выполнено.

Я не правовед. Юридических тонкостей расследования не знаю. Но я прошу Вас понять меня как вдову, на руках которой остались четверо несовершеннолетних детей.

Неужели я не имею права знать, почему следствие тянется столь длительный срок? Это ведь не хозяйственное многотомное дело с десятками ревизий. Неужели для расследования рядового ДТП необходимо более года?

У меня складывается впечатление, что расследование преступления затягивается умышленно, преднамеренно по той причине, что виновник ДТП — бывший сотрудник милиции, имеющий влиятельных родственников, связи и деньги. Иного объяснения происходящему я найти не могу.

Прошу Вас как должностное лицо, осуществляющее высший надзор за соблюдением законодательства в нашем государстве, принять конкретные меры к тому, чтобы работники прокуратуры Березовского района должным образом отнеслись к исполнению своих служебных обязанностей при расследовании данного дела, не затягивая его и не отделываясь отписками, строго руководствуясь Законом, а не личными связями и знакомствами.

Валентина РАЗУМЕЙЧИК, жительница г.Березы Брестской области.

Стоп-кадр

Што б гэта значыла?

Фота Васіля БЫСАВА.

У гродзенскай праваслаўнай епархіі будзе свой герб

Уласны герб атрымае да свайго 100-годдзя Гродзенская праваслаўная епархія, якая адзначыць гэты юбілей у наступным годзе. На ім будзе адлюстраваны шматколерны крыж з рознымі ўпрыгожаннямі ў выглядзе ромбаў. Многія элементы герба можна ўбачыць на фасадзе размешчанай у абласным цэнтры Барыса-Глебскай (Каложскай) царквы, якая была ўзведзена ў XII стагоддзі і з'яўляецца самай старажытнай з дзеючых у нашай рэспубліцы цэркваў.

Пры ўдзеле кіраўніка епархіі епіскапа Арцемія эскіз герба распрацаваны старшым навуковым супрацоўнікам БелНДІ дакументазнаўства і архіўнай справы Анатолем Цітовым, які з'яўляецца таксама правадзейным членам украінскага і польскага геральдычных таварыстваў і ганаровым членам аналагічнага Еўрапейскага таварыства. Як стала вядома карэспандэнту БелТА, гэты герб ужо атрымаў благаславенне мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі.

Канстанцін БАЛАТЭВІЧ, БелТА.

Гродна.

Узнагароды

Французы прызналі рэчыцкае піва цудоўным напіткам

Да шматлікіх узнагарод, заваяваных за апошнія гады рэчыцкімі піваварамі, дабавілася яшчэ адна. Французская асацыяцыя — каардынатар праграмы "Партнёрства дзеля прагрэсу" — паведаміла адміністрацыі арэнднага прадпрыемства "Рэчыцкі піўзавод" аб узнагароджанні яго прызам "Залаты Меркурый".

Такой узнагароды ў рэспубліцы ўдастоена амаль 40 розных арганізацый. Аднак півавары ў спісе прызёраў аказаліся ўпершыню.

Віктар КОТАЎ.

Францыск Скарына паўстане перад мінчанамі ў бронзе

Грашовыя сродкі ў памеры 1 мільярд 400 мільёнаў рублёў будуць накіраваны ў гэтым годзе на фінансаванне работ па будаўніцтве ў Мінску помніка беларускаму першадрукару, вучонаму, асветніку-гуманісту Францыску Скарыну. Аўтары праекта — скульптар Алесь Дранец і архітэктар Аляксандр Камлюк. Прадугледжваецца, што помнік будзе ўстаноўлены недалёка ад Нацыянальнай акадэміі навук.

Аксана АСПІШЧАВА.

Жыццё як яно ёсць

Кожны шануе чырвоны сцяг па-свойму

Над кожным домам вёскі Барэц Ноўгарад-Северскага раёна, што на Чарнігаўшчыне, як паведаміла інфармацыйнае агенцтва "Інтэрфакс", развяваюцца чырвоныя сцягі. Мясцовыя жыхары выкарыстоўваюць іх, каб зберагчы курэй ад высока лунаючых у небе каршуноў. Чырвоныя сцягі неўзабаве з'явяцца на Віцебшчыне зусім з іншай нагоды. Хутка кастрычніцкія святы, якія па традыцыі ў вобласці адзначаюць з размахам. Дарэчы, праслойка правільных камуністаў партыі таварыша Чыкіна, у тым ліку і ва ўладных структурах, тут найбольш вялікая ў краіне. З вялікай радасцю было сустрэта вяртанне сталінска-лукашэнкаўскай дзяржаўнай сімволікі, а на месцах, асабліва ў сельскай мясцовасці, так спяшаліся пазбавіцца ад ненавісных бел-чырвона-белых сцягоў, што не знайшлі нічога лепшага, як перашыць старыя бээсэсэраўскія на новы лад. Таму нярэдка можна было бачыць на будынках выканкамаў выцвілыя за гады гібрыды з заплаткамі, праз якія так і прасвечваўся серп і молат. Новыя сцягі цяпер навучыліся нават вывешваць правільна, а не дагары нагамі, як спачатку. І калі нядаўна з будынку аднаго з сельсаветаў Пастаўскага раёна знік і нават быў разарваны чырвона-зялёны сцяг, кіраўнік мясцовай вертыкалі шум падымаць не стаў, а раніцай хуценька вывесіў новае палотнішча. Чаго-чаго, а гэтага дабра ў нас цяпер хапае.

Стала менш бычкоў на фермах, а мяса — на прылаўках

Пры агульным незайздросным стане спраў у сельскай гаспадарцы Беларусі асабліва напружаная сітуацыя ў жывёлагадоўлі. Вось і на Віцебшчыне ўсё больш калгасаў і саўгасаў, нягледзячы на забароны, пускаюць пад нож жывёлу, каб нейкім чынам вырашыць свае шматлікія праблемы, выдаць работнікам невялікую зарплату. З пачатку года пагалоўе кароў і свіней скарацілася ў вобласці яшчэ на 4 працэнты. За 9 месяцаў закуплена мяса ад усіх катэгорый пастаўшчыкоў 50,8 тысячы тон, або на 11 працэнтаў менш леташняга. Нават прыватны гаспадар пераарыентаваўся на камерцыйныя структуры і зменшыў продаж жывёлы дзяржаве на 42 працэнты ў параўнанні з 1996 годам. Улады сцвярджаюць пра нейкі міфічны рост у галіне, але нават яек закуплена ў рэгіёне 186,3 мільёна штук, ці на 3 працэнты менш за мінулагодні ўзровень. Толькі цэны за гэты перыяд не стаялі на месцы і імкліва змяняліся ў адзін бок — зразумела, павелічэння.

Вытворцам — даўгі, сабе — шыкоўныя заробкі

Беларускі калгасны лад не толькі не рэфармуецца, але і не змяншае колькасці чыноўнікаў ад зямлі. Каб і надалей існавала планава-размеркавальная сістэма аграпрома, сёння толькі ў штаце Віцебскага аб'яднання "Мясамалпрам" знаходзяцца 56 работнікаў. І пачуваюць яны там сябе нядрэнна, калі ўлічыць, што летась гадавы фонд іх зарплаты склаў 6,9 мільярда рублёў. Апетыт у работнікаў аб'яднання, відаць, неблагі, і на заробкі ўжо сёлета выдаткавана за першае паўгоддзе 6 мільярдаў 300 мільёнаў рублёў. Няхітры арыфметычны падлік паказвае, што выходзіць унушальная сума заработнай платы, якая радавой даярцы Мані нават і не прысніцца ў самым фантастычным сне. Сяляне, наадварот, у нас даўно змірыліся, што маюць сціплыя жабрацкія заробкі, якія калі і дадуць ім, дык са спазненнем на месяц-другі. Дарэчы, запазычанасць Віцебскага ВА "Мясамалпрам" калгасам і саўгасам вобласці за прададзеныя мяса і малако складала на пачатак кастрычніка 60,2 мільярда рублёў.

Зноў у Саветы ідуць камуністы

Канстытуцыйная рэформа па Лукашэнку быццам бы завяршылася, а на месцах тым не менш працягваецца выбарчы марафон. На 16 лістапада па вобласці ў чарговы раз прызначана галасаванне па давыбарах дэпутатаў абласнога і шэрагу мясцовых Саветаў. Дарэчы, акрамя Віцебскага гарадскога ў Наваполацку і Барані дзейнічаюць прадстаўнічыя органы ўлады, выбраныя яшчэ за савецкім часам. Характэрная асаблівасць цяперашняй кампаніі ў тым, што найбольш актыўнічаюць камуністы, якія зарэгістраваны кандыдатамі ў дэпутаты па большасці вакантных акруг. Як разабрацца выбаршчыкам, калі ў Полацку на адным з участкаў іх адразу два — ад ПКБ і КПБ. Затое ніводнага прадстаўніка ад БНФ не ўбачаць людзі ў выбарчых бюлетэнях, ды і астатніх дэмакратаў не густа. Шчыруюць толькі дзеячы мясцовых арганізацый ЛДП, БПСМ, Славянскага сабора, іншых "патрыётаў". Пытанне, ці пойдуць людзі наогул галасаваць, тым больш што сродкаў на перадвыбарчую агітацыю не выдзелена зусім. Ды і сама вертыкаль наўрад ці захоча падзяліцца з кім-небудзь сённяшняй сваёй неабмежаванай уладай.

З раддома ў алкаголікі

Як папярэджваюць вучоныя, сацыяльныя праблемы дзетак на Беларусі набываюць небяспечны характар. Толькі на Віцебшчыне за 9 месяцаў бягучага года 91 нованароджаны малыш у мірны час застаўся сіратой — ад іх адмовіліся маці. Летась у вобласці наогул пазбавілі бацькоўскіх правоў 151 такую гора-матулю, 112 татаў і абодвух бацькоў у 131 сямейнай пары. А сёлета зафіксаваны нават беспрэцэдэнтныя факты нараджэння чатырох малышоў, заражоных сіфілісам, і нават чатырох немаўлят-алкаголікаў. Кожны чацвёрты падлетак, па звестках медыцынскіх структур, не ў стане ў поўным аб'ёме засвоіць школьную праграму, а 12 працэнтаў дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў маюць зараз выражаныя разумовыя і фізічныя недахопы. Бліжэйшая перспектыва, калі не прыняць рашучых захадаў, абяцае стаць яшчэ горшай.

Уладзімір ШЫК.

Крымінал

Разбой не ўдаўся

Вечарам 27 кастрычніка на трасе Віцебск — Смаленск каля вёскі Вароны Віцебскага раёна быў прадухілены дзёрзкі разбойны напад.

Група злачынцаў, адзін з якіх быў апрануты ў форму маёра міліцыі, спыніла аўтобус з камерсантамі, што накіроўваўся ў Расію. Акрамя таго, у іх распараджэнні быў аўтамабіль "Аўдзі-100", забяспечаны праблiскавым маячком. Аднак злачынцы не падазравалі, што аўтобус суправаджаюць супрацоўнікі КДБ і МУС. У адказ на выстрал з абрэза, які павінен быў запалохаць камерсантаў і прымусіць іх без шуму аддаць грошы і рэчы, вартавыя парадку прымянілі табельную зброю на паражэнне. У выніку двое грабежнікаў былі паранены.

Чацвёра астатніх нападаўшых спрабавалі ўцячы ад праследавання, выкарыстаўшы аўтамабіль. Ад'ехаўшы паўтара кіламетра, яны кінулі машыну на дарозе і зніклі ў лясным масіве. Траіх з іх затрымалі супрацоўнікі УУС, ДАІ, АМАПа, якія падаспелі на месца здарэння. Пошук чацвёртага злачынцы, асоба якога ўстаноўлена, працягваецца.

Вольга СІДАРОВІЧ.

SOS!

Дык дзе ж указ у падтрымку беларускай мовы?

Сродкі масавай інфармацыі даносяць да нас безліч фактаў скасавання беларускай мовы ў дзіцячых садках, школах, ПТВ і іншых установах. У ВНУ з ёй ужо, можна сказаць, расправіліся.

Цвяроза ацэньваючы сітуацыю, невялічкая група людзей — шчырых патрыётаў Айчыны, хапаючыся за саломінку, стварыла Таварыства беларускай мовы. Пагадзіцеся, сам факт існавання такога таварыства — сорам для краіны. Гэта ўсё роўна, што стварыць куток піянераў у Палацы піянераў. Хіба ж беларуская мова і нацыя павінны і могуць трымацца на энтузіязме жменькі сяброў бяспраўнага таварыства? Хіба ж моўнае пытанне — гэта не пытанне вярхоўных улад краіны? Хіба ж не Савет бяспекі Рэспублікі Беларусь павінен адвесці пагрозу, якая навісла над нацыяй? Мне, простаму грамадзяніну, сорамна за стан роднай мовы і страшна за будучае свайго народа. А вам, паважаныя кіраўнікі дзяржавы? Напэўна, вы лічыце, што саюз з Расіяй вымагае такіх вялізных ахвяр. Але чаму ж мы не можам з гонарам увайсці ў гэты саюз, як гэта робіць Расія, не губляючы нацыянальнага аблічча?

Хачу звярнуцца асабіста да Вас, паважаны Аляксандр Рыгоравіч. Бо менавіта на гады Вашага кіравання прыходзіцца найбольшы ўціск на беларускую мову. Напэўна, Вы памятаеце, як у мінулым годзе на адным з апошніх пасяджэнняў Вярхоўнага Савета 13-га склікання (напярэдадні рэферэндуму) заявілі, што Вамі рыхтуецца ўказ у падтрымку беларускай мовы. Столькі надзей Вы тады пасеялі ў шчырых патрыётаў Айчыны! Але дзе ён, той указ? Замест яго Вы неўзабаве ўвялі закон аб наданні "роўнага" статусу рускай мове. Пагадзіцеся, што такая "падтрымка" роднай мовы нагадвае дапамогу выкліканага дадому доктара, які кідаецца не да паміраючага гаспадара, а да яго здаровай ружавашчокай жонкі.

Паважаны Аляксандр Рыгоравіч, адважуся запэўніць Вас, што нельга стаць нацыянальным лідэрам, калі не адстойваць нацыянальных каштоўнасцей свайго народа. Я ўжо даўно ў пенсійным узросце, і ногі дрэнна згінаюцца, але гатовы стаць на калені і прасіць Вас аб адным: заступіцеся ж Вы за беларускую мову, уважце растаптаны гонар беларуса. Бо пакрыўджаны расіянін (хоць такіх у нас, здаецца, няма) можа лёгка знайсці падтрымку і прытулак у сваёй вялікай краіне. А куды падацца пакрыўджанаму этнічнаму беларусу?

Моўнае пытанне закранае інтарэсы ўсёй краіны, незалежна ад палітычных поглядаў грамадзян. Таму лічу, што і Вярхоўны Савет 13-га склікання, легітымнасць якога прызнае Еўропа, павінен падзяліць адказнасць за стан роднай мовы і разгледзець пытанне пра ход выканання Закона "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" (1990 г.) на сваім сходзе альбо, калі будзе кворум, пасяджэнні.

Сямён ЗАБРАДЗЯНЕЦ, пенсіянер.

Гомель.

Дзякуй!

Ёсць прыхільнікі, ёсць

Сакратарыят ТБМ імя Ф.Скарыны шчыра дзякуе ўсім, хто з'яўляецца прыхільнікам роднага беларускага слова і хто фінансава дапамог нашай арганізацыі:

Гродзенская арганізацыя ТБМ — 1 млн. 262 тыс. руб.,
выдавецтва "Полымя" — 5 млн. руб.,
Георгій Штыхаў — 500 тыс. руб.,
Іван Леўчанка — 200 тыс. руб.,
Георгій Пракаповіч — 100 тыс. руб.,
Ядвіга Котляр — 100 тыс. руб.,
Людміла Судзілоўская — 50 тыс. руб.,
С.Талуць — 100 тыс. руб.,
Якаў Саракваш — 300 тыс. руб.,
ТАА "Олдэран" — 500 тыс. руб.,
ТАА "Хаксія" — 500 тыс. руб.,
В.Лукашэвіч — 150 тыс. руб.,
Сяргей Бабенка — 100 тыс. руб.,
В.Леванюк — 100 тыс. руб.,
Валянціна Яновіч — 100 тыс. руб.,
Валянціна Шапарава — 50 тыс. руб.,
Генадзь Валашкевіч — 50 тыс. руб.,
Марыя Лявонава — 100 тыс. руб.,
Святлана Цішук — 300 тыс. руб.,
Сяргей Пракаповіч — 50 тыс. руб.,
Галіна Баркоўская — 500 тыс. руб.,
Л.Бастунец і калегі — 780 тыс. руб.,
Мікалай Ермакоў — 100 тыс. руб.,
Сяргей Бярозка — 100 тыс. руб.,
Антон Раманчук — 50 тыс. руб.,
Галіна Пархімчык — 100 тыс. руб.,
Клаўдзія Анісава — 50 тыс. руб.,
Мікалай Усцімчук — 100 тыс. руб.,
Яўген Астапчык — 100 тыс. руб.,
Мікалай Рамакавец — 500 тыс. руб.,
Алесь Станкевіч — 200 тыс. руб.,
Зора і Вітаўт Кіпелі — 100 долараў,
Васіль Петруковіч — 100 тыс. руб.,
Эдуард Яромаў — 100 тыс. руб.,
Рада ТБМ Партызанскага раёна — 90 тыс. руб.,
Мікалай Гардзеенка — 300 тыс. руб.,
Генадзь Брыль — 100 тыс. руб.,
Іван Януховіч — 70 тыс. руб.,
Таццяна Барэль — 100 тыс. руб.,
Павел Сцяцко і кафедра мовазнаўства — 1 млн. 458 тыс.,
Гродзенская гар. арганізацыя БНФ — 620 тыс. руб.,
а.Ян Матусевіч — 3 млн. руб.,
Вольга Іпатава — 300 тыс. руб.,
Жыхары г.Кобрына і сельскія настаўнікі р-на — 1 млн. 830 тыс.,
Мікола Грынчык — 200 тыс. руб.,

Тым, хто таксама жадае дапамагчы ТБМ, падказваем рэквізіты: 220005, Мінск, вул.Румянцава, 13, тэл.: 233-25-11, 233-12-52, разліковы рахунак 3015212330014, код 764 у Гардырэкцыі Белбізнесбанку г.Мінска.

Валютны №3012001824001 у Банку знешнеэканамічнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь.

Людміла ДЗІЦЭВІЧ, намеснік старшыні Таварыства беларускай мовы.

Народная Воля 31 КАСТРЫЧНІКА 1997 г.

Дайджест

В наступление на оргпреступность пойдут бригады. Британско-российские...

О сенсационном соглашении, достигнутом в ходе переговоров британского премьер-министра Тони Блэйра и президента Ельцина пишет "Дэйли Телеграф". Британская разведка МИ-6 и Федеральная служба безопасности объединят свои усилия в борьбе с организованной преступностью, контрабандой наркотиков и терроризмом. Планируется начать с обмена опытом, а затем сформировать смешанные британско-российские бригады. Первые операции будут проведены в Лондоне, который британские спецслужбы считают одним из главных центров отмывания денег росскийскими гангстерами. Особое внимание британцы хотят уделить контрабанде наркотиков из Афганистана в Европу через Россию и надеются на помощь росссийских коллег, пишет "Дэйли Телеграф".

Каддафи обвиняют в пособничестве терроризму

Ливия в обход торгового эмбарго закупала американское оборудование через третьих лиц — фирмы в Британии и других странах НАТО, пишет "Чикаго Трибьюн". Правительство полковника Муамара Каддафи, обвиняемое в пособничестве терроризму, закупало американские компьютеры, насосы, оборудование для очистки дизельного топлива и для бурения скважин. Например, с 1994 по 1996 год некая техасская компания сделала свыше ста отгрузок на адрес английской фирмы. Далее, товар, состоящий из оборудования, запчастей и антикоррозионной жидкости, был отправлен в Ливию. Эмбарго на торговлю с Ливией были наложены президентом Рейганом в 1988 году. Тем самым американское правительство надеялось вынудить Каддафи выдать США двух ливийских граждан, причастных к взрыву самолета авиакомпании "Пан Америкен" над городом Локерби в Шотландии.

Больше веры в Бога и терпимости к русскому православию

Газета "Джермани Лайв" публикует материал, посвященный состоявшейся недавно в польском городе Ченстохова встрече глав католической церкви государств Восточной и Западной Европы. Встреча прошла под эгидой 27 конференции Европейского Совета католических церквей. Газета сообщает, что помимо традиционных вопросов, которые обсуждаются на подобных встречах, и призывов к гражданам Европы проявлять больше веры и терпимости, на этот раз главы католической церкви приняли достаточно важное решение. На конференции было решено установить самые тесные и дружественные отношения с Русской православной церковью. Газета также сообщает, что, по мнению католических священников, это стало возможным после принятия в России закона "О свободе совести". Новый российский закон, по словам представителей католических конфессий, является далеко не идеальным, но на его основе уже можно строить прочные и вполне доверительные отношения.

Есть оружие генное и... компьютерное. Вирусное

Газета "Вюрцбургер Тагесблатт" комментирует последний доклад Министерства обороны Германии, который недавно был опубликован в немецких средствах массовой информации. По мнению Министерства обороны Германии, в последнее время над миром нависла угроза несанкционированного распространения генного и компьютерного оружия. Немецкие военные высказывают крайнюю обеспокоенность тем, что за последние десятилетия было разработано большое количество всевозможных микроорганизмов, созданных с помощью генной инженерии, и компьютерных вариантов оружия, таких, например, как неизлечимые компьютерные вирусы и так далее. Проблемой же защиты от этого оружия никто не занимался. В результате, пишет газета, в случае потери контроля над таким оружием или его несанкционированного применения мир может оказаться на грани катастрофы, спасения от которой на сегодняшний день нет.

Две Кореи создали один воздушный коридор

Представители Северной и Южной Кореи почти договорились открыть воздушное пространство своих стран для самолетов друг друга, сообщает "Ассошиэйтед Пресс". Принципиальное согласие Северной Кореи открыть свое воздушное пространство для самолетов всех стран было получено еще в прошлом году. Это принесло бы ей 125 миллионов долларов ежегодно, поскольку авиакомпании платили бы ей за пролет своих самолетов. Однако осталась проблема связи между диспетчерами Северной и Южной Кореи, которые должны обеспечивать полеты. Северная Корея пока отказывается обеспечить прямые контакты между диспетчерами. Однако она обещала открыть свое воздушное пространство с декабря этого года, поэтому соглашение между двумя Кореями должно быть подписано в ближайшие дни в Бангкоке.

Месторождения нефти покупаются и продаются. По-крупному...

Компания "Оксидентл Петролеум" объявила о своем согласии купить у правительства Соединенных Штатов месторождение сырой нефти и природного газа, принадлежащее военно-морскому флоту, за 3 миллиарда 650 миллионов долларов. В случае успеха это будет крупнейшей приватизационной сделкой в истории США. Месторождение расположено в Элк Хиллз, в 15 милях от города Бейкерсфилд в штате Калифорния. Его запасы оцениваются в миллиард баррелей сырой нефти, их хватит на 30 лет. С покупкой месторождения "Оксидентл Петролеум" утроит свои запасы нефти и удвоит запасы газа на территории США. О планах продажи месторождения в Элк Хиллз президент Клинтон объявил в прошлом году. Кроме "Оксидентл Петролеум" желание купить эту федеральную собственность выразили еще 15 компаний.

"Компьютерофобия" к бездушным монстрам. Которую все же превозмогают...

"Компьютер — друг или враг человека?" — репортаж на эту тему представляет в газете "Канзас-сити Стар" корреспондент "Ассошиэйтед Пресс" Доналд Ротберг. Компьютеры вездесущи, для кого-то они чудесные машины, открывающие путь к массивам информации, для кого-то — бездушные монстры. В поломках компьютера эти люди винят себя. Технологический прогресс для них обернулся проблемой, которую психологи назвали "компьютерофобия" и рассмотрели на примере Федерального правительства США. В целом служащие были подавлены компьютеризацией рабочих мест, но некоторые быстро приспособились, а остальные условно разделились на "сопротивление" и "покоренных". Причем представители "сопротивления" гораздо чаще расплачиваются стрессами, а эффективность и производительность труда у них ниже. Однако служащие превозмогают свою фобию. За текущий год они научились работать в "Интернете" и отправили почти 3 миллиарда писем по электронной почте.

Подготовила Светлана РОСТОВА.

Украина

Образование внутри СНГ "отдельных союзов" создает дополнительные препятствия для развития интеграции

Президент Леонид Кучма считает, что создание внутри СНГ "отдельных союзов" создает дополнительные препятствия для развития двусторонних экономических связей между странами — членами Содружества. Об этом он заявил в интервью журналистам в Феодосии (Крым).

Такого же мнения, по словам Л.Кучмы, придерживаются в том числе и лидеры государств СНГ, вступивших в Таможенный союз, который "давно существовал на бумаге, но не работал".

Президент также сообщил, что на внеочередном саммите СНГ в Москве 23 январе докладчиком по вопросу о создании единого экономического пространства внутри Содружества выступит президент Казахстана Нурсултан Назарбаев.

"С нашей помощью он даст анализ существующих в данной области проблем и поможет найти приемлемое решение", — сказал Л.Кучма.

Коснувшись украинско-российских отношений, президент заявил, что они укрепляются и развиваются не только в военной сфере, но и на политическом уровне. "Россия — наш великий сосед, мы должны помогать друг другу и из этого должны исходить", — отметил Л.Кучма. Он добавил, что на предстоящей 16—17 ноября неформальной встрече с Борисом Ельциным, договоренность о которой была достигнута в Кишиневе, "будут обсуждены главные проблемы".

Казахстан

Нурсултан Назарбаев высказывается за создание общего рынка и таможенного пространства СНГ

Президент Нурсултан Назарбаев считает, что "хорошее будущее" у Содружества есть только в том случае, если "все 12 государств смогут создать нормальное таможенное пространство, хотя бы как в Западной Европе". По его словам, лидеры СНГ договорились об этом и подписали протокол.

Комментируя в Алма-Ате итоги кишиневского саммита СНГ, глава государства в беседе с журналистами отметил, что "понимание необходимости создавать реальный общий рынок СНГ пришло за эти годы ко всем странам Содружества". Если такой общий рынок СНГ будет создан, "отпадет необходимость иметь союзы двух, четырех", — считает Н.Назарбаев, отметив при этом, что такие образования "кого-то возмущают".

В этой связи глава Казахстана сообщил, что на заседании саммита в Кишиневе президенты Украины, Узбекистана высказали мнение о том, что "разноскоростная интеграция не способствует общему сближению".

В ответ на эту критику Н.Назарбаев предложил "рассмотреть единственный вопрос о создании общего свободного рынка, общего таможенного пространства Содружества". Он считает необходимым обеспечить возможность "спокойно" провозить грузы через территорию стран СНГ, идентифицировать тарифные платежи, таможенные пошлины, свободно осуществлять движение людей, капиталов. Все это, отметил Н.Назарбаев, нужно сделать "в интересах простых людей, живущих в наших государствах".

Президент сообщил, что на закрытом заседании Совета глав СНГ, которое продолжалось в течение трех часов, он выступил с предложением "не рассматривать никаких других вопросов, пока эти не решим".

Н.Назарбаев напомнил, что полгода назад на саммите СНГ он выступил с пакетом предложений о реорганизации Содружества. В Кишиневе президент Казахстана заявил, что, поскольку ничего из предыдущих предложений не выполнено, "рассматривать и подписывать новые документы не имеет смысла".

Президент Казахстана "единственно хорошим предложением" кишиневского саммита назвал решение о регулярном — два раза в год — проведении заседания глав государств СНГ.

Российская Федерация

Рейтинг Бориса Ельцина растет

Если в апреле нынешнего года деятельность президента Бориса Ельцина одобряли 24% россиян, то к октябрю их число выросло до 28%. Соответственно сократилось и количество тех, кто не одобрял работу главы российского государства, — с 75% в апреле до 70% в октябре.

Такие сведения предоставили "Интерфаксу" социологи Всероссийского центра изучения общественного мнения по итогам опроса взрослого населения РФ в ходе опроса 1600 россиян.

Аналогичная тенденция наблюдается и в рейтинге премьера Виктора Черномырдина: если в апреле его деятельность одобряли 25% опрошенных, то в октябре — 30% (неодобряющих было соответственно 72% и 66%).

Несколько увеличилось за этот период и количество тех, кто одобряет деятельность первого вице-премьера Анатолия Чубайса: с 15% в апреле до 21% в октябре (не одобряют 83% и 75% соответственно).

При этом сократилось количество "поклонников" другого первого вице-премьера — Бориса Немцова, хотя, согласно опросам, он продолжает пользоваться наибольшей популярностью среди российских политиков. Однако если в апреле его работу одобряли 58% респондентов, то в октябре — 47% (неодобряющих было 38% весной и 48% осенью).

По материалам "Интерфакса".

Стоп-кадр

На печально известной площади Таньаньмынь столицы Китая теперь порядок. Полный...

Фото Синьхуа-БелТА.

Конкурсы

Юных піяністаў чакае выпрабаванне і ўзнагарода – піяніна

Другі Міжнародны конкурс юных піяністаў імя Ірыны Цвятаевай пройдзе ў Мінску з 1 па 7 лістапада пад патранажам спецыяльнага фонду прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. У ім прымуць удзел каля 60 юных музыкантаў з сямі краін — Беларусі, Украіны, Расіі, Малдовы, Польшчы, Латвіі і Літвы.

Першае такое творчае спаборніцтва адбылося тры гады таму ў Барысаве, і тады конкурс меў статус рэспубліканскага. Сёлета ён прысвечаны 80-годдзю з дня нараджэння Ірыны Цвятаевай — таленавітага беларускага педагога, якая выхавала цэлую плеяду выдатных піяністаў.

Як паведамілі карэспандэнту БелТА ў Бюро нацыянальных конкурсаў і фестываляў Белдзяржфілармоніі, спаборніцтва будзе праходзіць у два туры па дзвюх узроставых катэгорыях. Абсалютны пераможца конкурсу атрымае ўзнагароду — піяніна "Беларусь". Акрамя таго, у кожнай узроставай групе будуць прысуджацца па тры грашовыя прэміі. Журы ўзначаліць заслужаны артыст рэспублікі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Ігар Алоўнікаў.

Акрамя творчага спаборніцтва, у рамках конкурсу адбудзецца канцэрт памяці Ірыны Цвятаевай. У суправаджэнні Дзяржаўнага камернага аркестра пад кіраўніцтвам Інгі Эрнста Райля на сцэне Канцэртнай залы Белдзяржфілармоніі выступяць вучні Ірыны Цвятаевай, сярод якіх Юрый Гільдзюк, Ігар Алоўнікаў і Цімур Сергяеня.

Эдуард ПІВАВАР, БелТА.

Ліст простага чалавека

"Не давайце чужынцамі быць..."

Родная мова — гэта душа народа, яго скарб, багацце і аздоба.

Я.Лёсік

Будзем шчырымі: прадстаўнікі іншых нацый часцей дапамагаюць сваім суродзічам, яны больш дружныя ў параўнанні з беларусамі. Памятаецца, у мяне нават неяк запыталі: "Чаму татары "якшаюцца" паміж сабою, а нашы хлопцы не сябруюць?" Не адразу знайшоў адказ, але задумаўся. Успомніў: калі служыў у арміі на Украіне, у нашым вайсковым калектыве часта абмяркоўваліся вось такія выпадкі. Дастаткова было зачапіць хоць аднаго "каўказца", як невядома адкуль прыбягалі дзесяткі джыгітаў, дапамагалі свайму кунаку і маглі добра "атмалаціць паганца". З такімі лепш не звязвацца, такіх не крыўдзяць. А вось калі збівалі нашага хлопца, дык яго рэдка хто абараняў, а яго землякі маглі стаяць побач і смяяцца.

Хаця ўжо нашы хлопцы даўно не служаць за межамі, але праблема засталася. На Беларусі здараюцца сітуацыі, калі бойка, нават збіццё, забойства адбываюцца пры маўклівым патуранні суседзяў, знаёмых, прахожых. Аб такіх выпадках былі публікацыі з крымінальнай хронікі ў друку. Пра адсутнасць дапамогі ў крытычны момант вядома і з расказаў адзін другому. А вось прадстаўнікі Прыбалтыкі і іншыя "нацыяналісты" больш салідарныя паміж сабою. Зямляцкія адносіны ў іх прыкметны на кожным кроку. У чым тут справа?

Адказ, мне здаецца, трэба шукаць у гісторыі. Многія народы захавалі сваю мову, культуру, звычаі, традыцыі, рэлігійнасць, геаграфічныя назвы, сімволіку, гістарычную памяць і іншыя "атрыбуты" кансалідацыі. Вось гэта і збліжае людзей. Усё гэта — духоўнае адзінства народа, яго душа. Захаваўшы сваю душу, грамадства застаецца народам, нацыяй, а страціўшы, становіцца насельніцтвам, або проста жыхарамі.

Захапіўшы наш край царскія, а потым і бальшавіцкія каланізатары рвалі нашы карані, наша адзінства. *"...Здзекваліся над мовай нашай і прагналі яе са школы, з судоў, з усіх інстытуцый"* (Я.Лёсік). Усюды выганяючы роднае слова, яны надалі беларускай мове статус "непатрэбнай". Навошта тады яе вучыць? Розныя рэлігійныя канфесіі таксама ўносілі раскол у грамадства. *"Каталік стаў сінонімам паляка, а праваслаўны — маскоўца. Беларусы-каталікі мянуюць сябе палякамі, а беларусы праваслаўныя — расейцамі"* (Я.Лёсік). Заменена большасць геаграфічных назваў. У школе не вучылі сапраўдную гісторыю Беларусі, наш народ страціў гістарычную памяць. *"У безупынным змаганні з нядоляй сваёю Беларусь страціла ўсё: сваю палітычную незалежнасць, сваю школу, асвету, законы (Літоўскі статут) ды нават імя свайго забыліся. Мы сталі нацыяй без імя, народам без прозвішча, гуртам "тутэйшых", "простых" людзей, "дзядзькамі" з забранага краю. Народ змогся, страціў апошнія сілы ды... заснуў летаргічным сном"* (Я.Лёсік). На старонках незалежных газет былі публікацыі аб тым, як восем разоў дзялілі Беларусь, абкарналі яе межы. Але нават не гэта самае страшнае, а тое, што загубілі наша адзінства, абакралі нашы душы. Максім Багдановіч пісаў:

Народ, беларускі народ!
Ты цёмны, сляпы, быццам крот,
Табою усягды пагарджалі,
Цябе не пускалі з ярма.
І душу тваю абакралі, —
У ёй нават мовы няма.

Страціўшы духоўнае адзінства, людзі Беларусі сталі чужымі паміж сабою, а чужыя рэдка дапамагаюць адзін другому: мая хата з краю... Лёгка быць смелым, адчуваючы падтрымку, як каўказскія джыгіты. Адсутнасць магчымай дапамогі параджае страх. Баязліўцы часцей уступаюць, іх філасофія звужаецца да слоў "абы ціха...".

Чаму дрэнна быць насельніцтвам і добра быць народам, нацыяй? Хачу прывесці вобразныя параўнанні. Насельніцтва — гара пяску. Павеяў ветрык, і ўсё рассыпалася. Народ — гэта цвёрды, моцны падмурак, здольны вытрымаць любыя віхуры. Насельніцтва не здольна аб'яднацца, каб абараніць свае правы, і яго можна бясконца рабаваць. *"Бо без мовы, без роднага слова народ як тое быдла, з якім робяць хто што хоча"* (Я.Лёсік).

Расійскай імперыі патрэбна была Беларусь без беларусаў, таму і праводзілася русіфікацыя. Ідзе яна і цяпер. Як цукар раствараецца ў вадзе, так і беларускасць у чужым навязаным асяроддзі. Ніякі сумленны чалавек не будзе аспрэчваць яўныя факты дыскрымінацыі карэннага этнасу. Колькасць кніг, газет, часопісаў на рускай мове ў дзесяткі, а можа, нават і ў сотні разоў большая, чым на беларускай. На Беларусі няма беларускага тэлебачання, беларускіх фільмаў, зачыняюцца беларускія школы і г.д. Колькасная перавага рускамоўных (дакладней, трасянкамоўных) грамадзян Беларусі — вынік працяглай русіфікацыі і не можа быць апраўданнем прапаганды рускага шавінізму.

У цывілізаваным грамадстве паважаюць правы меншасці. *"Самадзяржавіе дбала пра тое, каб мы забыліся, што мы беларусы, каб мы выракліся мовы нашай і ўсяго роднага, з дзяцінства нам мілага, ды парабіліся маскоўцамі або расійцамі. І самадзяржавіе мабілізавала дзеля гэтага ўсю сваю моц: школы, суды, цэрквы, жандармаў, чыноўнікаў і ўсё, што магчыма было"* (Я.Лёсік). Гэта ж самае, толькі ў больш хітрай форме, рабілі і кіраўнікі Крамля. Вынішчаючы мясцовую культуру і навязваючы сваю, каланізатары набываюць права быць гаспадарамі на захопленых землях. Калі на Беларусі гучыць толькі руская мова, прычым не лепшы яе варыянт, дык тады наш край будзе лічыцца часткаю Расіі. Гэта прычына для ўмяшання краіны-суседкі ў нашы ўнутраныя справы, і тады па праву "старэйшага брата" размеркаваннем нашага здабытку будуць займацца кіраўнікі Крамля. *"З усіх падаткаў, якія збіраў маскоўскі ўрад з нашай Беларусі, нават палавіна не варачалася дадому, а тое, што вярталася, ішло на такія ўстановы, каторыя прыносілі нам адну шкоду, як, напрыклад: паліцыя, чужая школа, земскія начальнікі, чужыя суды, законы і т.д."* (Я.Лёсік). Урад БССР таксама плаціў Маскве каланіяльны падатак, значную частку якога трацілі на ўзбраенне і падтрымку крамлёўскіх сатэлітаў за мяжою. А савецкі народ жыў у галечы.

Мова і нацыянальная ідэя — гэта падмурак дзяржаўнасці. У гісторыі не было багатых калоній. Трэба быць гаспадарамі ў сваім **Доме**. Толькі свая краіна можа забяспечыць для ўсіх дабрабыт. *"...Покі не запануе ў краю яго (народа) наша родная беларуская мова, да таго часу ён (народ) будзе бедны, цёмны і галодны"* (Я.Лёсік). І гэта сапраўды так.

Войны дзялілі народы на каланізатараў і залежных ад іх "абарыгенаў". Усе свабодныя людзі захавалі сваю дзяржаўнасць і карыстаюцца роднай мовай. Страціўшыя самастойнасць, суверэнітэт, паднявольныя "абарыгены" "абшчаюцца" на чужой мове метраполіі. Пасля распаду імперыі былыя калоніі паступова адраджаюць сваю мову і культуру. Гэты працэс актуальны і для Беларусі. На жаль, прарасійскія імперскія сілы топчуць гэтыя кволыя парасткі.

Доўгі час адносіны паміж народамі складваліся па "закону джунгляў", з пазіцыі сілы. Магутныя краіны заваёўвалі, захоплівалі слабых. Іх моц "прырастала" за кошт другіх.

Заняўшы чужы край, каланізатары імкнуліся "застолбить", як кажуць, прыхватызаваць паднявольныя тэрыторыі. Для гэтага яны вынішчалі мясцовую культуру, "ірвалі карані" і навязвалі свае погляды, каб быць гаспадарамі ў чужым **Доме.** Так рабілі амаль усе агрэсары, заваёўнікі, захопнікі, інтэрвенты — "інтэгратары". У гэтым сэнсе рускія каланізатары не горш і не лепш за іншых. Асабліва люта дзейнічалі іспанскія канкістадоры. На занятых землях яны выжылі са свету амаль усіх індзейцаў, не кажучы ўжо пра іх культуру.

Неабходна ўсім бараніць наш родны **Дом — Беларусь,** суверэнітэт, самастойнасць. Апалагеты шавінізму заяўляюць, што рускія і беларусы — гэта амаль адзін народ. Я думаю, што гэта хлусня. Нейкае падабенства рускай і беларускай моваў створаны штучным шляхам у час "рэформы" 1933 года. Больш чым за 200 гадоў рускага панавання беларусы так і не навучыліся гаварыць па-руску, а гаворваць на "трасянцы". Мая маці не ведала чужой мовы і ніколі не карысталася ёю. *"А як цяжка беларускаму дзіцяці вывучаць расійскую мову, — ведама кожнаму. Язык іх не можа выгаварыць шорсткіх расійскіх слоў"* (Я.Лёсік). Праўдзівасць гэтага я пазнаў на сабе, калі вучыўся ў школе. Захавалася фанэтыка роднай мовы. Ды і самі рускія не прызнаюць беларусаў сваімі рускімі. *"Не трэба думаць, што калі навучыўся крошку граматна гаварыць і пісаць па чужому, дык ты ўжо і не беларус. Твой рот цябе выдасць. І палякі, і маскоўцы смяюцца з польскае і рускае мовы нашых перакінчыкаў"* (Я.Лёсік). Ды і сёння, пачуўшы нашу "трасянку", рускія крыва ўсміхаюцца: "Бульбаш". Дастаткова ўспомніць парад лялек на НТБ з удзелам галоўнага беларускага персанажа. Нават сам Лукашэнка па-руску гаворыць з акцэнтам.

"Для нас, сучасных дзяцей Беларусі, тымі лекамі, той вадою жывучай і гаючай ёсць наша беларуская мова і асвета на грунце роднай культуры" (Я.Лёсік). Бацькі, якія пасылаюць сваіх дзяцей у рускую школу, самі таго не жадаючы, іх духоўна абкрадваюць, *"калечаць душы іх, дапамагаюць абмаскаліваць родны край..."* (Я.Лёсік). Разам з рускай мовай прывіваецца рускі менталітэт, руская імперская ідэя. З нашых хлопцаў рыхтуюць будучых ваякаў для будучых "афганістанаў", "таджыкістанаў", "чэчняў" і г.д. Шырока сягае "сфера расійскіх інтарэсаў", толькі вайой.

Я.Лёсік пісаў, як вучылі ў школах на Беларусі ў пачатку XX стагоддзя: *"Уся навука па школах была накіравана на здзек і знішчэнне ўсяго беларускага. Усе кніжкі, падручнікі, малюнкі падбіраліся і дапасоўваліся так, што наша роднае ўхілялася ўбок, аддавалася на смех, выскалянне і кпіны, тапталася нагамі і мяшалася з гразёю, а за прыклад выстаўлялася чужое, велікарускае, дзецям не даступнае і малазразумелае. І калі часам траплялася, што абысці чаго немагчыма было, дык яго наўмысля малявалі ў такіх ганебных хварбах, што наівным дзецям заставалася толькі сароміцца, цурацца, забываць і выракацца"* (Я.Лёсік). У свой час, калі я вучыўся ў школе, адчувалася перавага ўсяго рускага над нашым родным. Выхаванне грамадзянства на прасторы ад Буга да Курыл размывае мясцовы беларускі патрыятызм, які абалгалі *"нацыяналізмам"* і фактычна забаранілі. Прыярытэт глабальных расійскіх інтарэсаў над мясцовымі прыводзіць да збядненя нашага краю. Такое выхаванне прыносіць шкоду і нашай краіне, і дзецям. Чужы патрыятызм не можа аб'яднаць людзей. Такія школьнікі пазбаўляюцца духоўнага адзінства паміж сабою, без якога не будзе ўзаемнай падтрымкі і дапамогі з маленства да старасці.

Каб адолець узнікшыя праблемы, кожнаму з нас патрэбна выручка. Часцей дапамагаюць адзін другому людзі, якія адчуваюць духоўную блізкасць. Усе нашы народы-суседзі шануюць сваё роднае, а мы абыякавы да яго. Дык што ж мы за людзі? Каб не быць чужымі паміж сабою, трэба вярнуць усё тое, што можа зблізіць нас.

Найважнейшым сродкам кансалідацыі грамадства з'яўляецца мова. *"Трэба нам самім шанаваць сваю мову і гаварыць скрозь па-беларуску, як гэта робяць расійцы ці палякі, тагды і чужыя людзі стануць шанаваць яе"* (Я.Лёсік).

